фильме показаны *народные промыслы* в виде известных на Западе матрёшек (1.19+). Присутствие льва напоминает о достижениях советского *цирка* (1.08+).

*Демонстрация научно-технических достижений*. Намёк на достижения советской *медицины* звучит уже в начале фильма. Хромой персонаж Е. Евстигнеева заявляет как бы между прочим: «Я слышал, что в России отличные ортопеды» (0.12+). Демонстрируя свою загипсованную ногу на протяжении всего фильма, в последней сцене он появляется уже здоровым (1.32+). Слова о том, что «хромого будем *лечить бесплатно*» (*выделено автором*) сбываются.

Советская *техника* и её возможности демонстрируются неоднократно. Это надёжность самолёта после разгерметизации (0.14+), прыгающие «Жигули» (0.29+), маневренность грузового автомобиля ЗИЛ (0.34+), демонстрация гонок «Жигулей» и «Москвича» (0.34+). Указанием на высокий уровень подготовки советских пилотов служат восклицания после аварийной посадки «Браво русскому пилоту!» (18+).

В фильме показана *инфраструктура*. В эпизоде аварийной посадки показаны автострада, на которую может приземляться лайнер (0.16+), порядок на дорогах, где даже самолёты подчиняются сигналам регулировщика (0.19+). А если произойдёт что-либо неординарное, то наготове экстренные службы (0.19+), что подтверждает безопасность путешествия по России. Дороги в России моют даже за городом (0.38+), а на пути в нужное время найдётся АЗС (0.40+). И жить туристам придётся в современных отелях типа «Метрополь» и «Россия» (0.26+), а по соседству будет огромный магазин – ГУМ (0.27+).

*Демонстрация уникальности* СССР/России и Ленинграда, показана в виде разводного моста (0.56+) и показа и словесного указания на белые ночей (1.07+).

*Исторические связи России и Италии* также упомянуты создателями фильма: директор театра говорит: «В этом театре пели Шаляпин и Каррузо» (0.52+), в конце фильма демонстрируется улица Зодчего Росси (1.23+).

**Заключение.** На примере фильма «НПИвР» мы видим возможности по использованию художественных фильмов для формирования внешнего имиджа. Беларуси нужно активнее использовать этот инструмент в своей политике, путём съёмок фильмов совместно с зарубежными партнёрами и продвижением их на иностранные кинорынки.


1. Тетерюк, А.С. Кинематограф как инструмент «мягкой силы». Китайский казус / А.С. Тетерюк // Геополитический журнал. – 2014. – № 5. – С. 84-95.
2. Рыбакова, М.Г. Предпосылки формирования политического имиджа страны в условиях воздействия массовой культуры (на примере США) / М.Г. Рыбакова // Научное мнение. – 2012. – № 8. – С. 51-58.
3. Берда, М.А. Рекламные технологии в культуре современного общества: product placement и cross-promotion / М.А. Берда // Вестник Московского университета. Сер. 10. Журналистика. – 2006. – № 5. – С. 112-120.
4. Невероятные приключения итальянцев в России // Вокруг ТВ [Электронный ресурс.] Режим доступа: http://www.vokrug.tv/product/show/neveroyatnye_priklyucheniya_italyantsev_v_rossii/ – Дата доступа: 30.01.2017.
5. Дзюба, Р.М. Аналіз сприйняття іміджу країни крізь призму кінофільмів / Р.М. Дзюба // Гилея: научный вестник. – 2015. – № 92. – С. 301-304.


## БЕЛАРУСЬ: АД ВЫТОКАЎ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ДА ПАЎНАВАРТАСНАЙ НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ


*І.У. Мандрык*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Пісьмовыя дакументы, прадметы матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія непасрэдна адлюстроўваюць гістарычны працэс дзяржаваутварэння, даюць магчымасць сцвярджаць, што палітагенез (паняцце, якое пазначае генезіс і развіццё палітычнай падсістэмы грамадства, якая можа трансфармавацца ў дзяржаву або яе аналаг), заўсёды займаў лепшыя розумы і настрой навукоўцаў. Распрацоўка тэарэтычных асноў аб стварэнні беларускай дзяржавы, аб трансфармацыі яе эканамічных, палітычных і ідэалагічных канструкцый вялася праз тысячагоддзі, пачынаючы ад старажытнасці. Гэта звязана з тым, што сістэма ведаў і ўяўленняў адносна вытокаў і этапаў станаўлення сваей дзяржаўнасці з'яўляецца састаўной часткай дзяржаўнай ідэалогіі краіны.

Актуальнасць тэмы заключаецца ў тым, што з улікам розных версій аб паходжанні беларускай дзяржавы і яе эвалюцыі да сваёй незалежнасці, якія склаліся ў гістарычнай навуцы,



Репозиторий ВГУ

аўтар даказвае канцэпцыю, што на беларускіх землях, як і ў іншых частках зямлі, на працягу стагоддзяў у працэсе гістарычнага развіцця адбывалася эвалюцыя палітычнай улады, структурызацыя грамадства і фарміраванне развітых інстытутаў кіравання.

У сувязі з гэтым аўтар ставіць сваей мэтай акрэсліць агульныя контуры даволі складанай праблемы станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях і падцвердзіць тэорыю заканамернага пераходу першабытнага грамадства да поўнавартаснай незалежнай беларускай дзяржавы, інтэгрыраванай у міжнароднае супольніцтва.

**Матэрыял і метады.** У ходзе падрыхтоўкі працы вывучаны шматлікія крыніцы старажытных часоў, кнігі найбольш вядомых замежных і айчынных гісторыкаў, дакументы ўладных структур. Даследаванне праводзілася на аснове агульнанавуковых і гісторыка-сістэмных метадаў. Ужываліся таксама іншыя агульнанавуковыя метады: аналізу, сінтэзу, індукцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** 1) Як сведчуць гістарычныя крыніцы, у працэсе развіцця прыроды і грамадства ў асобных рэгіёнах Зямлі яшчэ ў нетрах неалетычнай цывілізацыі адбываецца расслаенне позняй радавой абшчыны абшчыны. Адсутнасць механізмаў, забяспечваючых узгадненне інтарэсаў і волі абшчыннікаў(ні дзяржавы ні права яшчэ не было) дазволіла старэйшынам абшчын , племянным кіраўнікам паступовa прысвойваць сабе лепшыя землі і сенажаці, самастойна распараджацца абшчынным багаццем. З паяўленнем прыватнай уласнасці, прагрэсам у развіцці гаспадаркі, падзелам працы адбываецца ўскладненне структуры грамадства, адбываецца пераход да класавага грамадства. З гэтага часу адбываецца фарміраванне спецыялізаванага апарату -групы людзей (фараон, цар, ваеннаначальнікі, прыдворныя, паліцэйскія і г.д.), якія на прафесійнай аснове выконвалі функцыі ўнутранага рэгулявання і знешняй абароны, выкарыстоўваючы больш звычаёвыя, чым узаконеныя нормы права.

2) Першымі дзяржавамі ў свеце, дзе адначасова і паралельна з дзяржаўнасцю фарміравалася заканадаўства, навукоўцы называюць дзяржавы Старажытнага Усходу Егіпет і Шумер, якія сфарміраваліся, прыблізна ў адзін час (5 тыс. гадоў назад, або некалькі раней.). Самым істотным чынам на характар і змест нараджаючыхся дзяржаў і прававых сістэм аказвала ўплыў пануючая ў грамадстве форма ўласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці**.** Так, для большасці ўсходніх дзяржаў найбольшае значэнне мела неабходнасць удасканальванне кіравання і арганізацыя буйных грамадскіх работ. Для узнікнення Афінскай і Рымскай дзяржаў значна большую роль адыгралі працэсы класаўтварэння і неабходнасць у гэтай сувязі падаўлення эксплуатуемых класаў. Неабходнасць стварэння механізмаў, забяспечваючых узгадненне інтарэсаў і волі ўласнікаў ў Афінах і Рыме прывяла да рэспубліканскай формы кіравання і развіцця тут рабаўладальніцкай дэмакратыі. Дзяржаўная форма ўласнасці на зямлю пры абшчынным землекарыстанні ў Кітаі, Індыі і іншых азіятцкіх дзяржавах стала прычынай узнікнення дэспатычных, аўтарытарных сістэм, пры чым роль законаў тут выконвалі маральна **-**рэлігійныя догмы и прававыя звычаі. У Спарце Дзяржаўная ўласнасць на зямлю, спалучаемая з яе разделам паміж членамі грамадскай эліты, прывяла да існавання арыстакратычнай рэспублікі.

3) Аб паходжанні беларускай дзяржавы і яе эвалюцыі на сення склаліся і абмяркоўваюцца розныя версіі. У дарэвалюцыйнай рускай , а затым савецкай гісторыяграфіі панавала канцэпцыя, што ў старажынасці існавала толькі старажытнаруская дзяржава – Кіеўская Русь, якая з'яўлялася калыскай рускага , украінскага і беларускага народаў. Такой жа думкі прытрымліваліся некаторыя беларускія гісторыкі (Л.С. Абэцэдарскі, А.І. Залескі, Я.К. Новік і інш.). Але, асобныя навукоўцы (В.В. Ключэўскі, Б. Рыбакоў, А.М. Нечкін, П. Лейбенгруб, Г.В. Штыхаў,інш.)у адрозненне ад прыхільнікаў такога падыходу больш асцярожна , не катэгарычна выказвалі думкі наконт Кіеўскай Русі.

Доктар гістарычных навук , прафесар Г.В. Штыхаў (як і Л. Аляксееў, М. Ермаловіч, Б. Грэкаў, А. Дварнічэнка, інш.) лічыў, што і ў часы Кіеўскай Русі на тэрыторыі сучаснай Беларусі існавалі Полоцкае, Віцебскае, Мінскае, Тураўскае, Навагрудскае , Лагойскае, і інш. княствы, якія мелі ўсе прызнакі самастойных дзяржаўных утварэнняў. Сістэму органаў улады і кіравання ў гэтых княствах, як правіла, складалі князь , вече , а таксама службовыя асобы: пасаднік, тысяцкі, ключнік, цівун, вышэйшыя прадстаўнікі царквы- епіскапы і ігумены. Доктар гістарчных навук , прафесар Я.К. Новік лічыць неабгрунтаваным меркаванне аб тым , што адзінай дзяржавы Кіеўская Русь і старажытна рускай народнасці не існавала [1, с. 457].

4). Стварэнне і развівацце дзяржаўнасці і дзяржавы як інстытута кіравання грамадствам на Беларускіх землях, як і ўвогуле ў свеце ,мелі доўгі шлях. Большасць навукоўцаў, кажучы аб



Рэпазіторый ВДУ

паходжанні беларускай дзяржавы, прытрымліваюцца тэорыі заканамернага пераходу першабытнага грамадства да дзяржаўна арганізаванага. Як яны указваюць, шлях фарміравання дзяржаўнасці і дзяржавы на беларускіх землях характэран тым, што тут практычна не мелася рабаўладальніцтва, у сувязі з чым пераход ад першабытнаабшчыннага ладу быў зроблен непасрэдна да феадалізму. Племянныя важакі і ваенныя кіраўнікі і іх акружэнне ператвараліся ў землаўласнікаў-феадалаў, а свабодныя абшчыннікі першапачаткова – у залежных сялян з захаваннем абшчыннай уласнасці, канчаткова – з выплатай даніны – пачатковай формы феадальнай рэнты. Гэта дазволіла хутка завяршыць генезіс феадалізму і утварыць моцную дзяржаву. Галоўнымі прычынамі перахода ад рода-племяннога ладу да класавага і дзяржаўнага яны называюць сацыяльна-эканамічныя фактары. Станаўленне маемаснай няроўнасці і ўмацаванне дзяржаўных структур было ўзаемаўвязана і ўзаемазалежна.

5) Важнейшым цэнтрам палітычнай кансалідацыі на беларускіх землях быў крывічскі горад Полацк. Полацк і яго воласць па праву лічацца вытокамі дзяржаўнасці на беларускіх землях.Ужо ў IX ст. Полацк актыўна ўключаецца ў палітычнае жыцце ўсходнеславянскіх плямён. “Аповесць аб мінулых часах” сведчыць, што пад 862 г. скандынаўскі князь Рурык, які прыняў уладу ў Ноўгарадзе, пры раздачы гарадоў “мужам сваім”, накіраваў палачанам князя [2, с. 18]. У другой палове X ст. Полацкае княства набыло важныя дзяржаўныя атрыбуты палітычнай самастойнасці, якія ў наступным надоўга захаваліся. Прыкладна ў 70-я гады X ст. у Полацку самастойна княжыў Рагвалод. Ен, як сцвярджае летапіс, “трымаў Полацкую зямлю і валодаў ёю і княжыў у ёй”. Г. Штыхаў адзначае , што “ У XI ст.Полацкая зямля сфарміравалася як моцная дзяржава ва Усходняй Еўропе. Полацк быў стольным горадам гэтага буйнага княства, якое мела сваю княскую дынастыю , моцнае войска , даволі развітую гаспадарку і значныя дасягненні ў галіне культуры” [3, с. 32 ]. Кожны новы крок у развіцці дзяржавы прыводзіў да далешага развіцця прававой сістэмы. У XII – першай палове XIII ст. Полацкая зямля –княства, што размяшчалася на тэрыторыі сучасных Віцебскай і значнай часткі Мінскай абласцей, набыла права і магчымасць ажыццяўлення ўнутранай і знешней палітыкі ад імя ўсяго грамадства ўнутры і зне сваей тэрыторыі, стала ажыццяўляць такія ўласцівыя для сябе прыкметы, як: наяўнасць пэўных механізмаў ( асобай сістэмы органаў і ўстаноў), якія рэалізуюць функцыі дзяржаўнай ўлады; замацаванне пэўнай сістэмы норм, санкцыянаваных дзяржавай (права), распаўсюджванне юрысдыкцыі дзяржавы на канкрэтнаую тэрыторыю.

6) На працягу стагоддзяў у працэсе гістарычнага развіцця (аб чым слушна заўважана ў прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ) на беларускіх землях, як і ў іншых частках зямлі, адбывалася эвалюцыя палітычнай улады, структурызацыя грамадства і фармаванне развітых інстытутаў кіравання [4, с. 3] . Высокага ўзроўню дасягнула грамадска- палітычная і прававая сістэма на беларускіх землях з утварэннем ВКЛ. Найбольш яскрава гэта праявілася ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг., дзе знайшлі адлюстраванне такія прынцыпы , як падзел улады на заканадаўчую, выканаўчую, судовую. ВКЛ па форме кіравання з’яўлялася акрэсленай манархіяй начале з вялікім князем. Тут усталяваўся адносна дэмакратычны лад, рэлігійная талерантнасць і этнакультурная цярпімасць. У гэты час адбывалася фарміраванне беларускай народнасці з яе важнейшымі складнікамі: дамінірваннем беларускіх зямель у эканамічным і культурным жыцці, старабеларускай мовай, ды іншымі рысамі.

Удасканальванне дзейнасці дзяржаўных структур адбывалася і надалей. Дзяржаўнасць непасрэдным чынам аказвала ўплыў на прымальны грамадскі парадак, сацыяльную устойлівасць грамадства, яго стабільнасць. Гэта забяспечвалася**,** у прыватнасці, прымяненнем розных мер, у тым ліку прымушэння, для таго каб усе члены грамадства захоўвалі нормы правапарадку, у тым ліку і тыя, якія успрымаюцца імі як несправедлівыя, не адказываючыя іх інтарэсам. У савецкі час беларуская дзяржава дэкларавала агульнанацыянальные каштоўнасці, вызначала меру і формы рэальнага ўдзелу насельніцтва ў палітычным жыцці, што заўседы ажыццяўлялася пад кантролем дзяржаўнага апарата (часам жорсткім).

7) Прызнакамі беларускай дзяржавы на ўсіх этапах (акрамя родава – племяннога ладу) з’яўляліся: па-першае, наяўнасць асобнай групы людзей, занятых выключна кіраўніцтвам усім грамадствам і абаронай яго эканамічнай і сацыяльнай структуры. Па-другое, -наяўнасць манаполіі на прымусовую ўладу у адносінах да ўсяго насельніцтва. Па-трэццяе, права і магчымасць ажыццяўлення ад імя ўсяго грамадства ўнутранай і знешняй палітычнай, эканамічнай , сацыяльнай, ваеннай функцыі. Па-чацвертае,сувярэннае права выдання законаў і правіл, аба-



Репозиторий ВГУ

вязковых для ўсяго насельніцтва. Па-пятае арганізацыя ўлады па вызначанаму тэрытарыяльнаму падзелу. Па шостае, манапольнае права на зыманне падаткаў і збораў з усяго насельніцтва, на фарміраванне грамадскага бюджэта і т.п.

8) Сучасная Беларусь увабрала ў сябе рысы розных эпох. Рэспубліка Беларусь –унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава, са сваей канстытуцыяй, вышэйшым органам дзяржаўнай ўлады. Беларуская дзяржава ажыццяўляе сукупнасць неабходных для грамадства ўнутраных (ажыццяўленне агульнай для краіны ўнутраннай палітыкі, рэгуляванне эканамічных і грамадскіх адносін) і знешнепалітычных (абарона краіны, вядзення дыпламатычных сувязей з іншвмі краінамі і т.д.) функцый.

Дзяржаўнае ўладкаванне Рэспублікі Беларусь мае тры ўзроўні публічнай ўлады: рэспубліканскі цэнтр, мясцовые органы і арганізацыі самакіравання. Пры гэтым дзяржаве адводзіцца роля нейтральнай, «надклассовой» сілы, здольнай задаволіць інтарэсы ўсіх сацыяльных слаёў шляхам ўстанаўлення прынцыпу справядлівага размеркавання і забеспячэння дабрабыту ўсіх членаў грамадства, пераразмеркавання даходаў, знішчыўшы такім чынам няроўнасць. Кожнаму грамадзяніну тут гарантуецца годны ўзровень жыцця і стварэнне ўмоў для бесперашкоднай рэалізацыі канстытуцыйных правоў на працу , сацыяльнае забяспячэнне, адукацыю, ахову свайго жыцця і здароўя. . Галоўным сродкам забеспячэння ўсіх членаў грамадства матэрыяльнымі і сацыяльнымі дабротамі з'яўляецца эканамічны рост.

Выбар дзяржаўнага ўладкавання з намерам будаўніцтва сацыяльнай дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь мае сваё тлумачэне. Па-першае, ўлічваўся гістарычна склаўшыйся менталітэт грамадзян краіны і запатрабаваны імі звыклы грамадскі парадак. Па-другое, рашэнне аб будаўніцтве сацыяльнай дзяржавы выклікана неабходнасцю інтэграцыі нашай краіны ў сусветнагаспадарчыя, сацыяльныя і гуманітарныя сувязі з арыянтацыяй выкарыстання вопыту асобных еўрапейскіх краін (Англіі, Германіі, Францыі, Швецыі, Швейцарыі) якія ўступілі ў пасляваенныя гады на шлях стварэння сацыяльных дзяржаў з сацыяльна рынкавай гаспадаркай і дабіліся дзякуючы гэтаму высокіх жыццёвых стандартаў і тэхніка-эканамічнага прагрэсу.

**Заключэнне.** Такім чынам, праз усе вышэйвыкладзеныя тэзісы, бачна, што ўладныя структуры існавалі задоўга да з’яўлення дзяржавы. Дзяржава як устойлівы тып і сацыяльны інстытут сфарміравалася пазднеі. Станаўлене першых дзяржаў ў свеце адбылося на Старажытным Усходе. Егіпет і Шумер, іншыя дзяржавы сфарміравалася яшчэ за пяць тысячагоддзяў да нашага часу. Самым істотным чынам на характар і змест нараджаючыхся дзяржаў і прававых сістэм аказвала ўплыў пануючая ў грамадстве форма ўласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці. На асобных этапах (у перыяд свайга ўзнікнення і ранняга станаўлення) дзяржаўныя інстытуты больш спрыялі багатым людзям (больш пазняя назва - эксплуататарскім класам ). Поўнае бяспраўе рабоў і цяжкае становішча беднякоў стваралі перадумовы для праяў пратэсту ў адкрытай і рэзкай форме, прыводзілі да сацыяльных ўзрушэнняў, якія падточвалі асновы існуючага сацыяльна-эканамічнага ладу, часам прыводзілі да гібелі дзяржаў і фармацый. У сувязі з гэтым ішоў пошук шляхоў устанаўлення больш прагрэсіўнага (справядлівага) грамадства. У выніку ў перадавых дзяржавах паступова складваліся тэраатычныя распрацоўкі а разам з гэтым - ўмовы, якія ў найбольшай меры забяспечвалі сацыяльную устойлівасць грамадства, яго стабільнасць, працоўную актыўнасць грамадзян, фарміраванне нацыянальных супольнасцей.

Не выклікае сумненняў выснова беларускіх гісторыкаў, што вытокі беларускай дзяржаўнасці адносяца да часу ўтварэння Полацкага і Тураўскага княстваў, а пазней Гародзенскага , Новагародскага і інш. Зародкавай формай дзяржаўнасці на Беларусі былі самастойныя племянныя княжэнні крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў. На аснове радавой абшчыны ў месцах іх пражывання паступова злажыўся лад ваеннай дэмакратыі, які з’яўляўся вышэйшай і апошняй палітычнай формай першабытнага грамадства. Тут князямі называліся племянныя правадыры. У далейшым наступіў такі момант, калі з ускладненнем грамадства ўменне і аўтарытэту племяннога старэйшыны было недастаткова. Вырастае неабходнасць мець асобных людзей, якім даручаецца адказнасць за паасобныя бакі грамадскага жыцця.Так на полацкай, тураўскай і інш. тэрыторыях узнікае дзяржаўны апарат.

Мае пад сабой рацыю сцвярджэнне, што станаўленне Полацкага, Тураўскага і іншых беларускіх дзяржаў – княстваў , створаная імі матэрыяльная і духоўная культура паслужылі моцным падмуркам дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях. Складанай прабле-



Репозиторий ВГУ

май для вучоных – гісторыкаў і на сення застаецца пытанне аб самастойнасці Полацка ад Кіева да 980 г., таксама пункт гледжання

на працэс утварэння і этнічную аснову дзяржаўнасці ВКЛ, а таксама на Кастрычніцкую рэвалюцыю ў Петраградзе і звязаныя з ей сацыяльна – эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні на ўскраінных тэрыторыях Расіі. Розныя адзнакі ў сучаснай гістарычнай літаратуры існуюць аб праграмных установках і практычнай дзейнасці палітычных партый і грамадскіх рухаў Беларусі па ўтварэнню нацыянальнай беларускай дзяржавы. Глыбокае канкрэна – гістарычнае асэнсаванне і ўзважаны падыход сведчыць аб тым, што Рада БНР і Народны сакратарыят ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы ўтварылі пэўную палітычную структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Гэта –важная старонка беларускай гісторыіі, значны крок у станаўленні дзяржаўнасці беларускага народа. Галоўнай жа вехай станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці ў ХХ ст. з'явілася абвяшчэнне БССР. Менавіта ў савецкай Беларуси, нягледзячы на недахопы і памылкі, створан магутны вытворча- эканамічны і навукова –тэхнічны патэнцыял, ажыцяўлены важныя сацыяльныя праграмы ў інтарэсах усяго грамадства. На якасна новы ўзровень узнялася культура народа.

Сення Рэспубліка Беларусь – універсальная самастойная цэнтралізаваная сацыяльна-палітычная арганізацыя, якая мае сваю тэрыторыю, валодае адмысловымі механізмамі кіравання і прымусу для рэгулявання сацыяльных адносін і ажыццяўлення ўнутраных і знешніх функцый. Беларуская дзяржава – гэта неабходны інстытут, без якога не можа існаваць і развівацца наша грамадства. На яе ўскладаюцца такія важныя функцыі як стварэння людзям неабходных умоў для нармальнага паўсядзеннага жыцця, уключэнне чалавека ў грамадства, сацыялізацыю яго праз працоўную,сямейна-бытавую, дасуговую, грамадска –палітычную жыццядзейнасць.

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.М. Забродскі [і інш.] / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – Ч. 2: Люты 1917–2000 г.
2. Повесть временных лет. – М.; Л.,1950. –Ч.1.
3. Штыхаў, Г.В Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г.В.Штыхаў. – Мн., 1999.
4. Конституция Республики Беларусь от 15 марта 1994 г. (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканском референдуме от 24.11.1996, в ред. решения республиканского референдума от 17.11.2004 № 1/0) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 05.01.1999. – № 1. – 1/0; 02.12.2004. – № 188. – 1/6032.

## ПРОДОВОЛЬСТВЕННОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ВИТЕБСКА НАКАНУНЕ ФЕВРАЛЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ 1917 Г.

*С.В. Мартинович*
*ГУ «ВРИКМ»*

Более ста лет назад, в результате Февральской революции 1917 г., в Российской империи было уничтожено царское самодержавие и провозглашена республика. События февраля 1917 г. пробудили к активности многомиллионные трудящиеся массы бывшей империи, во многом определили дальнейший ход не только российской, но и мировой истории. И по сей день не теряет актуальности рассмотрение причин Февральской революции, исследование (в том числе и на местном материале) объективных противоречий, вызвавших к жизни народное недовольство и революционный взрыв, уничтоживших царскую власть в России.

Цель работы – показать влияние условий жизни трудящихся города Витебска, их положения в годы Первой мировой войны на формирование революционной ситуации накануне Февральской революции 1917 г.

**Материал и методы.** В работе использованы материалы исследований Э.М. Савицкого и периодической печати Витебска первых месяцев 1917 г. Использованы общенаучные и специально-исторические методы исследования – историко-генетический, сравнительный, системный.

**Результаты и их обсуждение.** Главным вопросом городской жизни было в начале 1917 г. положение с продовольствием и предметами первой необходимости. По итогам 1916 г. продовольственное положение Витебска оценивалось как «благоприятное» («лучше, чем в других городах») [1]. Но это отнюдь не говорило о благополучии. Трудящиеся города испытывали острую нужду в дешевых товарах первой необходимости. С началом Первой мировой войны



Репозиторий ВГУ